# Трыбуна для ўсіх

Часопісу "ARCHE" чатыры гады, Вы трымаеце ў руках яго дваццаць першы нумар. "ARCHE" застаецца такім, якім ён быў на пачатку, — народным часопісам для ўсіх, хто хоча жыць і гаварыць па-свойму ды па-свойму думаць. Часопісам вольнае думкі, які займаецца асэнсаваньнем беларускай і сусьветнай рэчаіснасьці. Нашы мэты — узбагачэньне літаратурнай мовы, спрыяньне творчаму наватарству, азнаямленьне чытача з замежнай гуманітарнай думкай. Мы па-ранейшаму не прымаем інтэлектуальнага снабізму, як і тупога асьветніцтва. Яснасьць думкі, сацыяльны і нацыянальны аптымізм, плюралізм пазыцый застаюцца нашымі прынцыпамі. Барацьба за сацыяльную справядлівасьць і ўмацаваньне эканамічнай і культурнай незалежнасьці Беларусі — нашы заданьні.

Агульная сытуацыя ў краіне зьмянілася ў выніку перамогі лукашыстаў на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году. Наступствамі гэтага стала расьцерушэньне нацыянал-дэмакратычных сілаў, канфіскацыя літаратурных часопісаў. "ARCHE" пачынаў выходзіць ва ўмовах, калі існавала большая разнастайнасьць літаратурна-мастацкіх выданьняў. Цяпер гэтага няма. Гэта паставіла нас перад неабходнасьцю зьменаў у канцэпцыі пэрыёдыка.

Абставіны прымушаюць "ARCHE" стаць трыбунаю для ўсіх — нягледзячы на эстэтычныя разыходжаньні, розьніцу пакаленьняў. Каб зрабіць часопіс таньнейшым, даступным па цане розным слаям насельніцтва, мы пераходзім з афсэтнай паперы на газэтную. Рэдакцыя пастараецца вытрымліваць штодвухмесячную пэрыядычнасьць выхаду. Мы адмаўляемся ад спэцыялізаваных "тоўстых" і "тонкіх" нумароў, аддаючы перавагу клясычнаму часопіснаму аб'ёму.

Выходзьце нам насустрач.